УДК 433



# Гісторыя прававога рэгулявання народна-гаспадарчага комплексу Беларусі (гападарча-прававое рэгуляванне ў старажытнасці і сярэднявеччы)

*History of legal regulation of national economic complex of Belarus (economic and legal regulation in antiquity and middle ages)*

**Пілецкі Віктар Аляксандравіч**[1]
*Piletsky Viktar*

1. *Доктар гістарычных навук, дацэнт, прафесар кафедры прававых дысцыплін Мінскага інавацыйнага універсітэта*
*Grand PhD in historical Sciences, Associate professor, Professor of the Department of legal disciplines of the Minsk Innovation University*
***e-mail:*** *ekonhistbel@mail.ru*

**Аннотация**
Прааналізавана гаспадарча-прававое рэгуляванне жыцця грамадства на тэрыторыі Беларусі ў старажытнасці і сярэднявеччы. Растлумачана сутнасць спецыяльнай тэрміналогіі. Паказана гістарычная эвалюцыя станаўлення форм гаспадарча-прававога рэгулявання. Названы і бегла прааналізаваны тэксты важнейшых крыніц права, якія сведчаць пра наяўнасць рэгулявання жыцця насельніцтва з дапамогай прававых нормаў.

**Ключевые слова:** права, першабытнае грамадства, народна-гаспадарчы, прававое рэгуляванне, сярэднявечча, звычаёвае права, звычай, рытуал.

**Abstract**
The article analyzes economic and legal regulation of society in Belarus in antiquity and the middle ages. It explaines the essence of special terminology. The historical evolution of the emergence of forms of economic-legal regulation is shown. The author names, and fled analyzes the texts of the most important sources of law that indicate the existence of regulation of life of the population through legal norms.

**Keywords:** law, primitive society, national economy, legal regulation, of the middle ages, common law, custom, ritual.

**Поступила в редакцию / Received:** 22.08.2016

**Web:** http://elibrary.miu.by/journals!/item.iot/issue.47/article.10.html

**Артыкул склалі матэрыялы, атрыманыя ў выніку праведзенага даследавання ў рамках выканання аднаго з этапаў навукова-даследчай працы (НДП) «Исследование правового регулирования народно-хозяйственного комплекса страны в историческом аспекте», у складзе агульнай кафедральнай тэмы НДП «Народно-хозяйственный комплекс страны и система правовых мер его защиты» (НДП № 03-3.1/ПД).**

**The article made the materials obtained in the result of the research conducted in the framework of the implementation of one of the stages of the scientific research work (SRW) «Study of the legal regulation of national economic complex of the country in the historical aspect», in the Department themes SRW «National-economic complex of the country and the system of legal measures for its protection» (SRW №: 03-3.1/ПД).**

## Уводзіны

Народна-гаспадарчы комплекс – гэта адно з паняццяў сучаснай тэрміналогіі, якое характарызуе гаспадарчую (у шырокім сэнсе) сістэму краіны, дзейнасць якой накіравана на сацыяльна-эканамічную стабільнасць грамадскага (дзяржаўнага) існавання. Паняцце «народна-гаспадарчы комплекс» аб'ядноўвае праблематыку эканамічных, сацыяльных, навукова-культурных, рэлігійна-ідэалагічных, палітычных і іншых пытанняў у мэтах паступальна-прагрэсіўнай эвалюцыі грамадства ў інтарэсах стабільнага забеспячэння жыцця насельніцтва краіны, атрымання дабаўленай вартасці для фарміравання бюджэту, накаплення навуковых, культурных і іншых каштоўнасцей як гарантыі стабільнага функцыянавання дзяржавы і грамадства. Народна-гаспадарчы комплекс падзяляюць на «сферу матэрыяльнай вытворчасці» і «невытворчую сферу» [1]. У апошнюю ўключаюць у тым ліку і «...ахову здароўя, адукацыю, культуру і мастацтва, навуку...» і інш. [2].

Таму, калі мы гаворым пра «прававое рэгуляванне» народна-гаспадарчага комплексу, то гэта не азначае вузкаэканамічнае рэгуляванне прававых норм і органаў (або нейкую толькі эканамічную правападпарадкаванасць). Тэма «Прававое рэгуляванне народна-гаспадарчага комплексу» хутчэй датычыць ролі права і прававой сістэмы ў жыцці грамадства цалкам, прычым і ў нематэрыяльнай, і ў духоўнай сферы ў тым ліку.

Ці можна выкарыстоўваць тэрмін «народна-гаспадарчы комплекс» у дачыненні да грамадства эпохі сярэднявечча ці першабытнасці? Адказ на гэтае пытанне можа быць наступны: можна, але толькі на той

 **© Минский инновационный университет, 2016**

стадыі гістарычнага развіцця, калі была «гаспадарка» і быў «народ».

Калі гаварыць пра гаспадарку», то гэтая лексічная адзінка (лексема) пазначае даволі старажытную з'яву. Грамадская гаспадарка зараджаецца разам з зараджэннем першабытнага чалавецтва. Найстаражытнейшыя людзі (для тэрыторыі Беларусі гэта неандэртальцы – каля 100–40 тыс. гадоў таму назад, і краманьёнцы – каля 40 тыс. г. да н.э.), інакш – гістарычна першасныя насельнікі беларускіх зямель, ужо мелі сваю грамадскую гаспадарку. Яна, канешне, была арганізавана з улікам прымітыўных форм сацыяльных узаемаадносін, гістарычна-архаічных прылад працы і гэтак далей, але ўсё-ж такі гэта была гаспадарка, якая была арганізавана людзьмі ў інтарэсах забеспячэння прадуктамі жыццядзейнасці тагачаснага грамадства.

Калі гаварыць пра народна-гаспадарчы комплекс як гістарычную з'яву, то неабходна звярнуцца да паняцця «народ». Высветліць яго месца ў гістарычнай эвалюцыі і генезісныя вытокі. У навуковай літаратуры слова «народ» ужываецца ў двух значэннях – у палітычным і культурна-этнічным. Палітычнае вызначэнне дадзенага слова часцей асацыіруецца з паняццем «нацыя». Маецца на ўвазе, што фарміраванне этнасаў праходзіць некалькі стадый. Спачатку яны фарміруюцца ў якасці пэўнай агульнасці (рус: общность) на падставе нейкіх этнічных каранёў (інакш: адбываецца «этнагенез»), потым у выніку сумеснага пражывання ў межах развіцця феадальных адносін адбываецца кансалідацыя этнасу да ўзроўню фарміравання народнасці, а потым на стадыі капіталізму пачынаецца станаўленне нацыі.

Так, напрыклад, тры братнія ўсходнеславянскія народы, згодна з найбольш абгрунтаванай тэорыяй, з дзеючых сёння (аўтар – маскоўскі вучоны В. Сядоў [3]), маюць наступны этнагенез. Беларусы з'яўляюцца вынікам сімбіёзу (інакш: шлюбна-роднаснага мяшання) балтаў і славян; адпаведна, рускія – вынік сімбіёзу фіна-вуграў і славян, а украінцы – скіфа-сарматаў і славян. Канчатковае фарміраванне народнасці ў беларусаў адбылося падчас станаўлення беларуска-літоўскай дзяржавы ВКЛ (другая палова XIII – сярэдзіна XVI ст.). А потым, калі беларускія землі сталі на шлях капіталістычнага развіцця, пачалося станаўленне нацыі. Завяршэнне фарміравання нацыі адбываецца ў кожнага народа па-свойму ў залежнасці ад спецыфікі яго гістарычнага лёсу, ад тых агульна-палітычных, сацыяльных і эканамічных умоў, у якіх працякала яго гістарычная эвалюцыя. Напрыклад, станаўленне нацыі ў беларусаў у выніку доўгага перыяду знаходжання ў складзе дзяржаў, створаных суседнімі народамі (у Польшчы і Расіі), што праводзілі палітыку паланізацыі і русіфікацыі насельніцтва Беларусі, канчаткова адбылося толькі ў канцы XX ст., пасля крушэння СССР і аднаўлення беларускай дзяржаўнасці.

Таму гаварыць пра народна-гаспадарчы комплекс як з'яву ў гісторыі народа можна, на наш погляд, толькі падчас станаўлення народа. Прычым пачынаць ужыванне гэтага тэрміна можна, напрыклад, падчас фарміравання першай са стадый этнагенезу – народнасці. І далей, падчас існавання нацыі, падчас развіцця індустрыяльнага і пост-індустрыяльнага грамадства.

Як жа вызначыць яшчэ больш ранні перыяд у развіцці гаспадарча-прававога рэгулявання (яшчэ да часоў узнікнення народнасці)? Для высвятлення ролі права ў жыцці грамадства на больш ранніх стадыях, на наш погляд, можна карыстацца тэрмінам «рэгуляванне гаспадарчых адносін» альбо тэрмінам «гаспадарча-прававое рэгуляванне». Было грамадства, былі грамадскія адносіны – значыць, было і нейкае рэгуляванне гэтых адносін. На, нейкага кшталту, прававой аснове.

Якім жа чынам адбывалася грамадска-прававое рэгуляванне гаспадарчых адносін на тэрыторыі Беларусі ў эпоху першабытнасці і сярэднявечча? Для адказу на гэтае пытанне патрэбна звярнуць увагу на ўзровень і спецыфіку развіцця грамадства на тэрыторыі Беларусі на працягу двух азначаных перыядаў. А яны сведчаць аб тым, што самыя раннія прыкметы грамадска-прававога рэгулявання гаспадарчых адносін у гісторыі патрэбна звязваць з зараджэннем асобных элементаў звычаёвага права.

Найстаражытнейшай формай грамадскага рэгулявання сацыяльных адносін было табу. Менавіта яно ўяўляла сабой і гістарычна-першасны элемент у працэсе фарміравання звычаёвага права. Табу – гэта значыць забарона нейкіх дзеянняў ці форм узаемаадносін у першабытным грамадстве. Асноўная колькасць відаў табу (забарон), на думку большасці даследчыкаў першабытнасці, узнікла ў эпоху праабшчыны (ці чалавечага статку), каля 100–40 тыс. гадоў таму назад [4, с. 69]. У перыяд, які папярэднічаў фарміраванню родавага ладу на тэрыторыі Беларусі.

Забароны, што фарміраваліся ў першабытным грамадстве вякамі, як правіла, мелі першапачаткова неабходны сэнс. У працэсе існавання чалавек заўважаў непажаданасць тых ці іншых форм жыццеўвасаблення, што ўплывалі на паспяховасць яго справаў, стан здароўя ці нараджэння патомства, розныя іншыя сферы жыцця і дзейнасці.

Адным з першых і найбольш гістарычна-ранніх відаў першабытных забарон было табу на полавыя ўзаемаадносіны паміж роднаснымі групамі мужчын і жанчын у інтарэсах засцярогі ад кровазмяшэння. Не выключана, што многія табу з'яўляліся і дзякуючы недасведчанасці

першабытных людзей аб навакольным асяроддзі або з-за містычна-рэлігійных забабонаў і г.д. Былі, відаць, пазней і табу архаічна-палітызаванага зместу, што стваралiся спецыяльна і прызначаліся для ажыццяўлення нейкіх грамадскіх мэтаў. Скажам, знахарска-шаманскія, ініцыятыўна-выхаваўчыя і інш. [5].

Чалавецтва, вынайшаўшы табу як формулу нечага недазволенага, змагло рэгуляваць многія працэсы без іх тлумачэння. Табу, як правіла, дзейнічала на містычна-рэлігійным ўзроўні. Табу, як і рытуал (інакш: цэрыманіял), звычай, абрад, былі па-за абмеркаваннем магчымасці і неабходнасці для асобнага першабытнага чалавека (індывіда). Гэта былі законы жыцця грамадства ў эпоху першабытнасці. Грамадскія забароны дысцыплінавалі, прымушалі падпарадкоўвацца бездакорна, стваралі своеасаблівы мікраклімат еднасці ў ранняродавай першабытнай абшчыне. Калі глядзець цалкам на розныя праявы грамадскіх узаемаадносін дародавай эпохі і родавага ладу, якія адыгрывалі важную ролю ва ўладкаванні сацыяльна-вытворчых, калектыўна-бытавых і іншых стасункаў чалавецтва, то нельга не адзначыць, што з цягам часу яны аформіліся ў так званае звычаёвае права [6].

Звычаёвае права, згодна з сучаснымі напрацоўкамі гістарычнай навукі, – гэта сістэма няпісаных (традыцыйна існуючых, вусных) прававых нормаў, якія былі заснаваны на агульнапрынятасці, даўнасці дзеяння, звычаёвасці [7] і іншых катэгорыях традыцыйнасці і былі ў гісторыі паступова санкцыяніраваны (зацверджаны, выкарыстаны) на больш познім этапе грамадскай эвалюцыі, нованароджанай дзяржаўнай уладай [8].

Звычаёвае права ўключала ў сябе пэўны комплекс традыцыйна дзеючых прававых нормаў, што рэгламентавалі ўсе сферы жыцця першабытнага чалавечага калектыву. Ён уключаў: сістэму абрадаў, звычаяў, рытуалаў, табу, розных іншых традыцыйна-выкарыстоўваемых ў грамадстве норм. Іх дзеянне распаўсюджвалася на сферу здабычы харчавання (паляванне, збіральніцтва, рыбалоўства, пазней: земляробства і жывёлагадоўлю), на сацыяльныя (у тым ліку міжпалавыя) узаемаадносіны, сферу выхавання дзяцей і адносін да састарэлых членаў родавага калектыву, на сферу культуры і мастацтва, рэлігійна-ідэалагічную сферу і інш. Дзеянне звычаёвага права як комплексу няпісаных прававых нормаў па якіх жыло чалавецтва ў дадзяржаўны перыяд сваёй эвалюцыі, з'яўляецца паказчыкам пэўнай эвалюцыйнай стадыі (узроўню развіцця) грамадства той ці іншай тэрыторыі.

Наступная стадыя грамадска-прававога рэгулявання гаспадарчых адносін у гісторыі Беларусі звязана з ўзнікненнем пісанага права. А яго з'яўленне было абумоўлена ўсталяваннем класавай структуры грамадства і зараджэннем дзяржаўнасці. Пануючым класам патрэбна было замацаваць сваё прывілеяванае становішча ў грамадстве. І гэта запатрабавала кадыфікацыі (сістэматызацыі) традыцыйна дзеючых (разрозненных, фрагментарных), агульнародавых вусных прававых нормаў. А таксама іх дапрацоўкі з пункту гледжання гарантавання сацыяльнай іерархіі.

Прававыя нормы пачалі запісваць (дапрацоўваць, класіфікаваць), афармляць у сістэматызваныя заканадаўчыя акты (кодэксы), якія паступова афармляліся па галіновым прынцыпе прыналежнасці і складаліся ў адзіныя нарматыўныя комплексы. Іх тэксты ўжо можна выкарыстоўваць для даследавання прававога становішча грамадства ў якасці крыніц права пэўнага перыяду.

Калі ў Беларусі з'явілася дзяржаўнасць, якая абумовіла гістарычна-першыя спробы кадыфікацыі права? Найстаражытнейшая дзяржаўнасць на тэрыторыі Усходняй Еўропы, месцы рассялення беларускага, рускага і ўкраінскага народаў, як сведчаць летапісы, распачалася ў IX ст. нашай эры. Самы старажытны з іх, «Аповесць мінулых гадоў» (рус: «Повесть временных лет»), паведамляе пра першыя княствы на тэрыторыі сучасных Беларусі, Расіі і Украіны. Ва ўводнай (недатаванай) частцы летапісу (датаванне пачынаецца з 852 г.) летапісец паведамляў, што паляне, драўляне, славене, а таксама дрыгавічы і палачане мелі свае племянныя княжанні – правобраз першапачатковага дзяржаўнага ўтварэння [9, с. 10]. Найбольшымі сярод іх былі: Кіеўскае (сучасныя землі Украіны, дзе ў той час пражывалі славянскія племянныя саюзы: паляне і драўляне), Полацкае (сучасныя землі Беларусі, заселеныя крывічамі і палачанамі), Наўгародскае (сучасныя землі Расіі, дзе пражываў славянскі племянны саюз: славене-наўгародцы).

Самымі стражытнымі першадзяржавамі-княствамі (на тэрыторыі рассялення беларусаў), што існавалі з IX ст., былі – Полацкае, Смаленскае і Тураўскае. Пазней, у X–XI стст., летапіс называе ўжо Віцебскае, Менскае, Друцкае, Мсціслаўскае, Слуцкае, Клецкае, Навагародскае, Ізяслаўскае і іншыя княствы. Станаўленне найранейшага з іх пачалося ў VIII–IX стст. вакол горада Полацка на р. Заходняя Дзвіна. Тут пачало фарміравацца аб'яднанне крывічоў, якое ў далейшым ператварылася ў самастойную тэрытарыяльную, палітычную і эканамічную адзінку. Першыя летапісныя звесткі аб Полацку адносяцца да 862 г. У першай палове IX ст. назіраўся працэс усталявання Полацкай зямлі ў пэўных геаграфічных межах і пачалося афармленне яе дзяржаўнасці, а разам з гэтым – і афармленне пісаных прававых норм.

Найранейшымі запісанымі прававымі нормамі (крыніцамі права першадзяржаўнага перыяду), тэксты якіх дайшлі да нашых дзён (на жаль, не ў арыгінале, а ў складзе Аповесці мінулых гадоў), былі дагаворы (дамовы) з

Візантыяй (860, 907, 911, 944 гг.). Яны былі складзеныя, адпаведна, па выніках паходаў усходнеславянскіх войскаў пад кіраўніцтвам кіеўскіх князёў Алега, а потым і Ігара Рурыкавіча. Тэксты дамоў 860 і 907 г. не захаваліся, але ўпамінанне аб іх ёсць у больш позніх дагаворах. У дачыненні да Беларусі тэкст аднаго з дагавароў сведчыць пра тое, што Полацк, які прымаў удзел у складзе кааліцыі пад кіраўніцтвам кіеўскага князя Алега, атрымаў права на даніну. Падчас устанаўлення даніны, якую абавязваліся плаціць кіраўнікі Візантыйскай імперыі, было вызначана колькаснае і адраснае яе прызначэнне. «…І заповеда Олег дати… уклады на Руския грады: первое на Киев, тоже на Чернигов и на Переяславль, и на Полтеск, и на Ростов, и на Любеч, и на прочая грады…» [10, с. 3]. Тэкст яшчэ аднаго дагавора (ад 944 г.) цікавы тым, што сярод паслоў ад кіраўнікоў усходнеславянскіх першадзяржаў называецца нейкі «Каницар Передславин», пасол, накіраваны нейкай Прадслаўай [9, с. 23]. Яе гісторыкі лічаць правіцельніцай Полацка (у першай палове X ст.) і маці князёў Рагвалода (полацкага) і Тура (тураўскага).

Тэксты дагавораў з Візантыяй, нягледзячы на тое, што яны дайшлі не ў арыгінале, выступаюць паўнапраўнымі крыніцамі права. Яны маюць характар міждзяржаўных прававых актаў. Галоўнае, на што яны былі накіраваны, акрамя перапынення вайны, гэта рэгуляванне гандлёвых адносін паміж двума рэгіёнамі (Русь і Візантыя) і вызначэнне правоў купцоў з усходнеславянскага (руска-беларуска-украінскага) рэгіёна на тэрыторыі Візантыі. Яны ўтрымліваюць нормы крымінальнага права: «адказнасць за забойства» (зыходзячы з пастулата кроўнай помсты у Дагаворы ад 944 г., «забойца можа быць затрыманы і пазбаўлены жыцця блізкімі сваякамі забітага»), «за крадзеж маёмасці», «цялесныя пашкоджанні», «рабаванне», «разбой» і інш.

Першай спробай агульнага «зводу» (збору, спісу, кодэкса) пісанага права можна лічыць «Праўду Роську» (у іншай транскрыпцыі: «Праўду Руську»), якую пазней пачалі называць «Руская Праўда», што як бы выключала беларусаў і ўкраінцаў з працэсу ўсходнеславянскага адзінства (з першых славян: «росаў», «русаў»). Хоць вядома, што так званая «Руская Праўда», не з'яўляецца помнікам гісторыі толькі рускага народа. Гэта адна з першых спроб кадыфікацыі (запісвання і дапрацоўкі з улікам інтарэсаў княжацкай улады) звычаёвага права, якое дзейнічала на ўсіх усходнеславянскіх (беларускіх, рускіх, украінскіх) землях у папярэдні перыяд (да ўзнікнення першых дзяржаў).

«Праўда Роськая» – гэта асобная крыніца права, помнік заканадаўства XI–XII стст. Самы ранні з тых, што дайшлі да сучаснасці, кодэкс прававых нормаў ранесярэдневяковай Русі. Яе тэкст дайшоў да нашых дзён у спісах XV ст., а таксама ў спісах XVIII–XIX стст. Праўду Роську падзяляюць на тры рэдакцыі: «Кароткую», «Пашыраную» (рус: «пространную») і «Скарочаную».

«Кароткая Праўда» – самая старажытная з іх. Яе дзеляць на: «Праўду Яраслава Мудрага» (гады княж.: 1009–1054), кіеўскага князя, сына полацкай князёўны Рагнеды Рагвалодаўны, і «Праўду Яраславічаў», сыноў Яраслава. Тэкст Праўды Роськай аформлены па галіновым прынцыпе прыналежнасці. Там змешчаны прававыя нормы, што накіраваны на рэгуляванне адносін у межах княжацкай (ці баярскай) гаспадаркі. Ён уключае ў сябе самыя запатрабаваныя, на стадыі станаўлення дзяржаўнасці, прававыя нормы. Сярод іх штрафы (выплаты): «за забойства»; «за нанясенне абраз» (рус: оскорблений); «за прычыненне калецтваў і збіццё»; «за крадзеж і псаванне чужой маёмасці» і інш.

Дарэчы, «Кароткая Праўда» яшчэ дапускае кроўнародную помсту. У артыкуле № 1 сказана, што «Калі чалавек заб'е чалавека, то помсціць брат за (забойства) брата, сын за бацьку ці дваюрадны брат, ці пляменнік з боку сястры». А калі ж ужо не акажацца блізкіх сваякоў забітага, то за гэтае злачынства патрэбна будзе заплаціць штраф у памеры 40 грывен. Наяўнасць прававой нормы, якая дапускае кроўную помсту, з'яўляецца яскравым доказам таго, што тэкст «Кароткай Праўды» як крыніцы ранефеадальнага права з'яўляецца гістарычна першапачатковым. Гэта значыць – вынікам першых спроб кадыфікацыі права на аснове звычаёвых норм, што дзейнічалі ў родавым перыядзе гісторыі Беларусі. Таму што «кроўная помста», як вядома, гэта норма перыяду звычаёвага права родавага перыяду. Яе знікненне ў гісторыі, прычым не толькі ў славянскай, але і іншых народаў свету, абумоўлена пераходам да класавага грамадства.

У тэксце дакумента ужо рэгулююцца ўзаемаадносіны сацыяльнай іерархіі. Тут адлюстравана класавая няроўнасць. Так, напрыклад, злачынства у выглядзе забойства княжацкага цівуна караецца больш вялікай сумай штрафа (80 грывен – арт. № 21). У той час, калі забойства звычайнага чалавека – «мужа» – было, відаць, па тагачасных прававых нормах, менш важным. За яго штраф быў устаноўлены толькі 40 грывен (арт. № 1) [11].

Прыкладам міждзяржаўнай дамовы як крыніцы феадальнага права, у гісторыі Беларусі можна таксама лічыць дагаворы Смаленска, Віцебска і Полацка з Рыгай, саюзам прыбалтыйскіх гарадоў і нямецкімі купцамі – 1229, 1263, 1265, 1309, 1338 гадоў. Найбольш вядомы з іх быў падпісаны ў 1229 г. паміж Смаленскім, Віцебскім і Полацкім княствамі з аднаго боку і Рыгай і Гоцкім берагам з другога, што ўвайшоў у гісторыю пад назвай «Смаленская гандлёвая праўда». Ён быў заключаны для ўстанаўлення добрасуседскіх адносін з нямецкімі суб'ектамі права і свабоднага гандлю па р. Заходняя Дзвіна і на

Балтыйскім узбярэжжы. У тэксце дамовы замацоўваліся нормы крымінальнага, грамадзянскага, гандлёвага і працэсуальнага права. Дагаворам вызначаліся памеры грашовых выплат за злачынствы. Сярод іх: забойства, гвалтаванне жанчыны, прычыненне калецтва, пралюбадзейства.

(Даведка: «Гоцкі бераг» – гэта летапісная назва вострава Готланд, аднаго з важных цэнтраў міжнароднага гандлю ў Паўночнай Еўропе. Член «Ганзейскага саюза» (Ганза – ням.: Hanse), самага доўгатэрміновага міжнароднага гандлёва-эканамічнага саюза, што існаваў у XIII–XVII стст.; трымаў свае прадстаўніцтвы – «канторы» – у буйнейшых гарадах Еўропы (у тым ліку ў Полацку і Ноўгарадзе) і кантраляваў увесь гандлёвы тавараразварот у рэгіёне Балтыйскага і Паўночнага мораў) [12].

У дагаворы яскрава адлюстравана прававое становішча розных сацыяльных груп насельніцтва, якое выразна сведчыць аб класавай структуры грамадства эпохі станаўлення феадалізму ў Беларусі. Так, забойства халопа каралася штрафам у памеры 1 грыўны срэбра, адпаведна, за вольнага чалавека – 10 грывен, а за царкоўнага служыцеля (папа) – у 2 разы больш: 20 грывен. Акрамя гэтага, у дагаворы падрабязна рэгуляваўся парадак разгляду спрэчных спраў і пытанняў ільготнага падаткаабкладання, памераў судовых пошлін і інш.

Цікава, што халопу, згодна з тэкстам дамовы, дазвалялася самастойна ўдзельнічаць у міжнародным гандлі і вызначаліся ўмовы выплат яго сваякам (для ўрэгулявання гандлёвых адносін з крэдыторамі) у выпадку яго смерці. Такія адносіны да феадальна залежных людзей, як вядома, былі не характэрныя для традыцый усходнеславянскага рэгіёна. Тут халоп не лічыўся праваадказным чалавекам (яго становішча было набліжана да раба). А таму наяўнасць падобнай нормы, відаць, была абумоўлена традыцыямі еўрапейскага грамадства. Дзе развіццё грашовых адносін у XIII–XIV стст. вяло да фарміравання буржуазнага сацыяльна-эканамічнага ладу.

## Заключэнне

Завяршаючы гаворку пра «Гісторыю прававога рэгулявання народна-гаспадарчага комплексу Беларусі...», можна з упэўненасцю заявіць, што вывучэнне гаспадарча-прававога рэгулявання тут трэба пачынаць з часоў старажытнасці і сярэднявечча. Але падчас даследавання гэтай праблемы неабходна карыстацца тэрмінамі «рэгуляванне гаспадарчых адносін» (альбо «гаспадарча-прававое рэгуляванне»).

Таму што «народна-гаспадарчы комплекс», у сучасным разуменні тэрміна, у той час яшчэ не сфарміраваўся, але прававое рэгуляванне гаспадарчых адносін ужо было. Гаспадарка як гістарычная з’ява узнікла ў гісторыі грамадства разам з узнікненнем чалавецтва. Першыя насельнікі тэрыторыі Беларусі з разраду «homo sapiens» ужо мелі хоць і прымітыўную, але грамадскую гаспадарку. І яна абавязкова патрабавала рэгулявання.

Старажытнейшай формай рэгулявання грамадскіх адносін у гісторыі чалавецтва было табу. Пазней рэгуляванне жыцця адбывалася пры дапамозе звычаёвага права. Яно аб’ядноўвала ў сабе ўсе традыцыйныя (вусныя) нормы і правілы тых часоў: абрады, звычаі, рытуалы, табу і інш. Пераход да класавай структуры грамадства і ўзнікненне дзяржаўнасці суправаджаліся працэсам кадыфікацыі права. Традыцыйна дзеючыя вусныя нормы пачалі запісваць (класіфікаваць), афармляць у заканадаўчыя акты (кодэксы), якія сёння лічацца крыніцамі права і дазваляюць характарызаваць былое грамадства.

Першымі прыкладамі крыніц права для Беларусі лічаць дагаворы з Візантыяй. Гістарычна пачатковай спробай агульнага зводу (збору, спісу, кодэкса) пісанага права была «Праўда Роська», якую нашы сучаснікі называюць «Русская Праўда». Акрамя вышэй пералічаных, крыніцамі права ў гісторыі Беларусі IX–XIII стст. лічаць дагаворы беларускіх княстваў з Рыгай, саюзам прыбалтыйскіх гарадоў і нямецкімі купцамі. Найбольш вядомы з іх быў падпісаны ў 1229 г. паміж Смаленскім, Віцебскім і Полацкім княствамі з аднаго боку і Рыгай і в. Готланд – з другога.

## Литература / References


1. Единый народнохозяйственный комплекс [Электронный ресурс] // Экономический словарь. – Режим доступа: http://www.ekoslovar.ru/104.html. – Дата доступа: 05.08.2016.

   Yedinyy narodnokhozyaystvennyy kompleks [Electronic resource] // Ekonomicheskiy slovar’. – Mode of access: http://www.ekoslovar.ru/104.html. – Date of access: 05.08.2016.

2. Третьякова, Е.С. Экономика предприятия: учеб.-метод. пособие для студентов инженерно-технических специальностей [Электронный ресурс] / Е.С. Третьякова. – Режим доступа: http://rep.bntu.by/bitstream/handle/data/869/%20%20%20%20%20%20%20%20%20%20%20%20%20.pdf?sequence=7. – Дата доступа: 6.08.2016.

   Tret’yakova, Ye.S. Ekonomika predpriyatiya: ucheb.-metod. posobiye dlya studentov inzhenerno-tekhnicheskikh spetsial’nostey [Electronic resource] / Ye.S. Tret’yakova. – Mode of access: http://rep.bntu.by/bitstream/handle/data/869/%20%20%20%20%20%20%20%20%20%20%20%20%20.pdf?sequence=7. – Date of access: 6.08.2016.

3. Седов, В.В. Восточные славяне в VI–XIII вв. / В.В. Седов; под общ. ред. академика Б.А. Рыбакова. – М.: Наука, 1982. – 328 с.

   Sedov, V.V. Vostochnyye slavyane v VI–XIII vv. / V.V. Sedov; pod obshch. red. akademika B.A. Rybakova. – M.: Nauka, 1982. – 328 s.

4. Семенов, Ю.И. Происхождение брака и семьи / Ю.И. Семенов. – М.: Мысль, 1974. – 309 с.

   Semenov, Yu.I. Proiskhozhdeniye braka i sem'i / Yu.I. Semenov. – M.: Mysl', 1974. – 309 p.

5. Токин, Н. Очерк происхождения религиозных верований / Н. Токин. – М.–Л.: Госиздат, 1929. – 112 с.

   Tokin, N. Ocherk proiskhozhdeniya religioznykh verovaniy / N. Tokin. – M.–L.: Gosizdat, 1929. – 112 p.

6. Юхо, Я.А. Звычаёвае права / Я.А. Юхо // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: БелЭн, 1996. – Т. 3: Гімназіі-Кадэнцыя. – С. 433–435.

   Yukho, Ya.A. Zvychaevaye prava / Ya.A. Yukho // Entsiklapedyya gistoryi Belarusi: u 6 t. – Minsk: BelEn, 1996. – T. 3: Gimnazii-Kadentsiya. – P. 433–435.

7. Марыскін, А. Звычай, старына / А. Марыскін // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: БелЭн, 1996. – Т. 3: Гімназіі–Кадэнцыя. – С. 435.

   Maryskin, A. Zvychay, staryna / A. Maryskin // Entsiklapedyya gistoryi Belarusi: u 6 t. – Minsk: BelEn, 1996. – T. 3: Gimnazii-Kadentsiya. – P. 435.

8. Юхо, Я.А. Крыніцы беларуска-літоўскага права / Я.А. Юхо; пад рэд. Т.Ф. Есіпенкі. – Мінск : Беларусь, 1991. – 238 с.

   Yukho, Ya.A. Krynitsy belaruska-litouskaga prava / Ya.A. Yukho; pad red. T.F. Yesipenki. – Minsk: Belarus', 1991. – 238 p.

9. Повесть временных лет / под ред. В.П. Адриановой-Перетц. – 3-е изд. – СПб.: Наука РАН, 2007. – 668 с.

   Povest' vremennykh let / pod red. V.P. Adrianovoy-Peretts. – 3-ye izd. – SPb.: Nauka RAN, 2007. – 668 p.

10. Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах: у 2 т. / рэдкал.: В.К. Шчарбакоў [і інш.]. – Менск: АН БССР, 1936. – Т. 1: IX–XVIII стст. / В.К. Шчарбакоў, К.І. Кернажыцкі, Д.І. Даўгяла. – 1936. – 678 с.

    Gistoryya Belarusi u dakumentakh i materyyalakh: u 2 t. / redkal.: V.K. Shcharbakou [i dr.]. – Mensk: AN BSSR, 1936. – T. 1: IX–XVIII stst. / V.K. Shcharbakou, K.I. Kernazhytski, D.I. Daugyala. – 1936. – 678 c.

11. Краткая Русская Правда с переводом (Правда роськая) [Электронный ресурс] // Российский государственный университет нефти и газа им. И.М. Губкина. – Режим доступа: http://vur-05-1.narod.ru/istotgp/2-1.htm. – Дата доступа: 15.08.2016.

    Kratkaya Russkaya Pravda s perevodom (Pravda ros'kaya) [Electronic resource] // Rossiyskiy gosudarstvennyy universitet nefti i gaza im. I.M. Gubkina. – Mode of access: http://vur-05-1.narod.ru/istotgp/2-1.htm. – Date of access: 15.08.2016.

12. Dollinger, F. La Hanse (XII–XVII siècle) / F. Dollinger. – Paris, 1964. – 555 p.